Европы. Конференция признала желательным запрещение труда детей до 12, а в южных странах - до 10 лет, установление для детей до 14 лет 6-часового и от 14 до 16 лет - 10-часового рабочего дня. Ограничить продолжительность рабочего дня для женщин 11-ю часами, а также предоставить им послеродовой отпуск. Признали недопустимой работу женщин и детей по воскресеньям и ночью.

В Германии в 1883 г. правительством Бисмарка было введено обязательное страхование рабочих на случай болезни, в 1884 г. был издан закон о компенсации рабочим в случае производственного травматизма, в 1889 г. было введено обязательное страхование по старости и инвалидности. В Великобритании начало законодательству о социальном обеспечении было положено в 1897 г., когда было введено обязательное страхование по болезни, в 1925 г.- по старости и инвалидности. Несколько позже на путь узаконенной системы социального обеспечения встала Франция, различные его виды (по старости и инвалидности, по болезни, беременности и родам и т.д.) были приняты одновременно.

Социальные пособия конца XIX - начала XX века были недостаточными как по размерам, так и по охвату ими трудящихся. И, тем не менее, первые законы о разного вида социальной помощи заслуживают позитивной оценки. Их значение состояло не столько в предоставлении некоторых минимальных гарантий выживания в экстремальных для людей ситуациях, сколько в создании прецедента и базы для дальнейшего расширения сферы социального страхования, последующего расширения трудовых прав, их распространения на новые группы работников. Первоначальные законодательные акты в дальнейшем дополнялись и совершенствовались, пока, наконец, в XX столетии не сложилась эффективная система социальной защиты населения.

Список использованных источников

1. Кучинский, Ю. История условий труда в Германии (1800 – 1945) / Ю. Кучинский. – М, 1949. -с. 188.
2. Бризон, П. История труда и трудящихся / П. Бризон. - М. - 1902. -с. 45.
3. Кучинский, Ю. История условий труда во Франции с 1700 по 1948 г. / Ю. Кучинский. - М., 1948. -с. 26.
4. Энгельс, Ф. К жилищному вопросу /Энгельс Ф. Маркс К. //Собрание сочинений. – М, 1955. - Т.1. С. 493.
5. Сборник документов по истории нового времени. 1870 – 1914. М., 1989. - С. 58, 96, 135, 141.

## ЗАХАВАНАСЦЬ ПРАСТОЛЬНЫХ СВЯТАЎ НА БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XX – ПАЧАТКУ XXI СТ.

**Александронец У.М.**
*Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны», Гомель, Республика Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – Яшчанка А.Р., канд. гіст. навук, дацэнт*

Істотным кампанентам святочнай культуры беларускага этнасу з’яўляюцца рэлігійныя святы, сярод якіх вылучаюцца і прастольныя. Прастольныя святы, якія праводзяцца ў гонар таго ці іншага хрысціянскага святога або падзеі з зямнога жыцця Ісуса Хрыста, за значны перыяд свайго развіцця даволі шырока распаўсюдзіліся на беларускіх землях. Актуальнасць тэмы звязана з тым, што на сучасным этапе адбываюцца працэсы рэгенерацыі і трансфармацыі традыцыйных святаў, з гэтай прычыны паўстае праблема іх захавання, адраджэння і перадачы нашчадкам.

Мэтай дадзенага даследавання з’яўляецца характарыстыка ступені захаванасці прастольных святаў на Беларусі ў канцы XX – пачатку XXI ст. Пры вывучэнні дадзенай тэмы быў прыменены метад палявога этнаграфічнага даследавання. Палявое даследаванне праводзілася аўтарам у 2009 – 2010 гг. дзеля больш глыбокага вывучэння і характарыстыкі ступені захаванасці прастольных святаў на сучасным этапе, вызначэння іх месца і ролі ў сучаснай святочнай культуры беларусаў.

Сучасныя асаблівасці праваслаўнага царкоўнага жыцця звязаны з павышэннем статуса рэлігіі ў грамадстве і суадносна – з трансфармацыяй дзяржаўна-царкоўных адносін. Галоўныя хрысціянскія святы, згодна з дзяржаўнымі пастановамі, у 1992 г. набываюць статус дзяржаўных, і святочныя дні становяцца днямі адпачынку на Беларусі. У наш час закладваюцца новыя храмы і з'яўляюцца новыя прастольныя святы, з імі звязаныя. Была ўзноўлена кананізацыя новых беларускіх святых [1, с. 13-14]. Працэсы ўзнаўлення рэлігійнага жыцця адбіваюцца і на рэканструкцыі абрадавага боку – павелічэнні паломніцтваў і ўзнаўленні дзейнасці святых месц, устанаўленні новых святаў і ўшанаванні новых святых. Ім прысвячаюцца грамадскія царкоўныя малітвы, службы. У імя святых асвячаюцца прастолы і цэрквы, у іх гонар уладкоўваюцца святы, іх выявы ўшаноўваюцца як іконы [2, с. 288]. Сёння нярэдка царкоўныя святы з нагоды рэканструкцыі ці будаўніцтва новых храмаў спалучаюцца з днямі пэўнага населенага пункта, набываючы свецкую афарбоўку, прыкладна так, як гэта адбывалася на Беларусі ў мінулыя стагоддзі.

Матэрыялы палявога этнаграфічнага даследавання ў Гомельскім раёне сведчаць пра тое, што з адраджэннем царкоўнага жыцця прастольныя святы не страцілі свайго значэння ў рэлігійнай культуры мясцовага насельніцтва. Сёння правядзенне прастольнага свята ў некаторых населеных пунктах абмяжоўваецца ўдзелам у царкоўным набажэнстве – «ета толькі ніхто не атмячае, памолімся ў царкве і дома паабедаем і ўсё» (Пашчасцева Н.П., 1926 г.н., в. Целяшы), «у нас святкуюць і шчас, толькі не з такім размахам і не ўсе» (Зайцава А.Н., 1926 г.н., в. Гадзічава). На пытанне «Ці прытрымліваюцца вашы родзічы, што пераехалі ў горад, звычаю святкавання прастольнага свята?» 73,9 % рэспандэнтаў адказалі адмоўна. Традыцыя правядзення прастольнага свята як пэўнага комплексу ў шматлікіх населеных пунктах раёна пачынае паступова згасаць – гэта звязана ў першую чаргу з парушэннем пераемнасці культурных традыцый. Моладзь, на думку інфарматараў, «не хоча етага» (Парфянцоў А.А., 1929 г.н., в. Чкалава). Сярод адказаў інфарматараў аб тым, ці хацелі б яны, каб прастольнае свята ў іх вёсцы адзначалася як і раней, большасць (95,7 %) адказвала станоўча. Добрая традыцыя правядзення прастольных святаў захоўваецца і адраджаецца ў некаторых населеных пунктах Гомельшчыны. Тут святкаванне прастольшчыны прымяркоўваецца да больш свецкай падзеі – свята вёскі.

Такім чынам, прастольныя святы на Беларусі ў канцы XX – пачатку XXI ст. паранейшаму адыгрываюць значную ролю ў грамадскай культуры беларусаў. Захаванне старых і з’яўленне новых прастольных святаў сёння звязана з дзейнасцю царкоўных прыходаў, асвячэннем новых храмаў. Больш важнае значэнне ў святкаванні прастольшчыны сёння займае свецкая частка, звязаная з супольным баўленнем вольнага часу вяскоўцамі і гаражанамі. Парушэнне пераемнасці вядзе да таго, што традыцыя правядзення прастольных святаў набывае невызначаныя рысы і ахоплівае мешную колькасць людзей. Пэўнай заменай традыцыйнага святкавання прастольшчыны сёння з’яўляюцца святы вёсак і гарадоў.

Спіс выкарыстаных крыніц


1. Гурко, А.У. Хрысціянскія святы на Беларусі: генезіс, эвалюцыя, асаблівасці: аўтарэф. дыс. … доктара гіст. навук / А.У. Гурко; Ін-т мастацтвазнаўства, энаграфіі і фальклору імя К.Крапівы НАН Беларусі. – Мінск, 2003. – 27 с.
2. Беларусы: Сучасныя этнакультурныя працэсы [Тэкст] / Г.І. Каспяровіч [і інш.]; рэдкал.: А.І. Лакотка [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы. – Мінск: Беларуская навука, 2009. – 607 с.: іл.
3. Архіў аўтара. Палявы сшытак № 3. 2009-2010 гг. «Прастольныя святы Гомельшчыны: гісторыка-этнаграфічная характарыстыка» – 24 арк.